4 (129)
красавік

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221 ад
8 лютага 2010 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

**НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС**

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны універсітэт**

***Рэдакцыйная калегія:***

*Галоўны рэдактар Васіль Кушнер*

**Сымон Барыс** (рэдактар аддзела), **Канстанцін Бандарэнка, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Максім Гальпяровіч** (намеснік галоўнага рэдактара), **Анатоль Грыцкевіч, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Надзея Кушнер** (рэдактар аддзела), **Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Лк... Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр ... Аляксандр Смолік, Васіль Стражаў, Сяргей Ход... Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***

**Уладзімір Адамушка, Тамара Анціховіч, Юрый Боха... Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галуб... Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Вячаслаў ... Ларыса Жэрка, Андрэй Каракін, Аляксандр Кахано... Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Ян Мілеўскі ... Вольга Нячай, Васіль Ракуць, Сяргей Рашэтнікаў, Т... Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Валерый Талкачоў, ... Анатоль Шаркоў, Захар Шыбека.**

## ЗМЕСТ

### 65 ГОД ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

**Вялікая Айчынная вайна** *(агляд матэрыялаў круглага стала, які адбыўся ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі 3 сакавіка 2010 г.). Падрыхтавала Надзея Кушнер.* 3

**Уладзімір Паўлаў** Беларусы ў руху Супраціўлення Чэхаславакіі 14

### АГРАРНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Леанід Казакоў** Узнікненне і развіццё фальваркаў у шляхецкіх уладаннях ў Вялікім княстве Літоўскім *(другая палова XVI—першая палова XVII ст.)* 22

### КОЛА ВЕДАЎ

**Неаніла Цыганок** Праведнікі народаў свету 31

## МЕТОДЫКА. ВОПЫТ


| | | |
|---|---|---|
| Вячаслаў Лазіцкі | Выкарыстанне электронных сродкаў навучання як шлях інтэнсіфікацыі надрыхтоўкі вучняў старшых класаў да выніковай атэстацыі і цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі Беларусі | 39 |
| Людміла Трыгорлава | Уклад беларускага народа ў Перамогу над фашысцкай Германіяй *(IX клас)* | 45 |
| Галіна Руціч | Падрыхтоўка да экзамену *(IX клас)* | 56 |
| Наталля Бартошык | Па слядах фашысцкіх злачынстваў. *Выхаваўчае мерапрыемства (XI клас)* | 62 |
| Соф'я Цвірко | Песні Вялікай Айчыннай вайны. *Выхаваўчае мерапрыемства (IX—XI класы)* | 68 |
| Данута Кургановіч | Вялікая Айчынная вайна: шляхам здабыткаў і перамог *Інтэлектуальна-пазнавальная гульня (IX, XI класы)* | 74 |
| | Содержание | 79 |
| | Summary | 80 |



*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 04.07.2005 г. № 101 «Беларускі гістарычны часопіс» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, палітычных, педагагічных, філасофскіх і юрыдычных навуках, а таксама ў адпаведнасці з загадам ад 05.10.2005 г. № 143 — па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*



***Адрас рэдакцыі: 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1, пакой 402;***
***220050, Мінск, вул. Ленінградская, 14, пакой 707.***
***Тэлефоны: (017) 284-02-20, 209-54-63;***
***факс: 284-02-20.***
**http://aiv.by; e-mail: aiv@aiv.by, bhc@aiv.by.**



**РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**
Падпісана да друку 10.04.2010 г.
Выхад у свет 23.04.2010 г. Афсетны друк.
Фармат $60x84^1/_8$.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11.
Наклад 1 338 асобнікаў. Зак. 0505.
*Надрукавана ў друкарні ААТ «Прамдрук».*
*Ліцэнзія № 02330/0494112 ад 11.03.2009 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*



Да ведама аўтараў!

За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць пясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 16 старонак (кегель 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экземплярах (пажадана з дыскетай). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), дакладны адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.

УВАГА!
Пераносы некаторых слоў, а таксама некаторыя абазначэнні на замежных мовах зроблены не па правілах граматыкі, а з улікам магчымасцей камп'ютэрнай настольна-выдавецкай сістэмы.

© «Беларускі гістарычны часопіс», 2010.



Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Выкарыстанне электронных сродкаў навучання як шлях інтэнсіфікацыі падрыхтоўкі вучняў старшых класаў да выніковай атэстацыі і цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі Беларусі



*ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч — дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат педагагічных навук. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Пінск. У 1989 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ і на працягу двух дзесяцігоддзяў працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 1 г. Пінск. Аўтар шэрага навукова-метадычных артыкулаў па праблемах укаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання.*

Абагульнены і сістэматызаваны педагагічны вопыт, а таксама тэарэтычныя распрацоўкі ў галіне прымянення электронных сродкаў навучання (ЭСН) дазваляюць прапанаваць навукова-метадычнае абгрунтаванне алгарытму арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з выкарыстаннем ЭСН на ўроках і факультатыўных занятках па гісторыі Беларусі , а таксама ў час самападрыхтоўкі выпускнікоў. Выкананне метадычных умоў рэалізацыі прапанаванага алгарытму дасць магчымасць настаўнікам больш эфектыўна ажыццяўляць падрыхтоўку вучняў старшых класаў да выпускнога экзамену па гісторыі Беларусі і да цэнтралізаванага тэсціравання.

Аналіз педагагічнай практыкі дазваляе сцвярджаць, што працэс прымянення электронных і традыцыйных сродкаў навучання ў межах выкарыстання інфармацыйных педагагічных тэхналогій на розных ступенях агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца часцей за ўсё на прыватным эмпірычным узроўні. Такая тэндэнцыя ў значнай ступені абумоўлена недастатковым валоданнем настаўнікамі існуючымі тэарэтычнымі напрацоўкамі, навыкамі сістэмнага прымянення электронных кампанентаў вучэбна-метадычных комплексаў (ВМК) на розных этапах навучання, а таксама тэхналагічнымі і дыдактычнымі недахопамі саміх ЭСН. Тэарэтычныя асновы тэхналагічнага падыходу да навучання з дапамогай камп'ютэрных сродкаў часцей за ўсё не ўлічваюцца пры распрацоўцы алгарытму засваення старшакласнікамі зместу вучэбнага матэрыялу, а метадычныя прынцыпы эфектыўнага прымянення ЭСН выкарыстоўваюцца фрагментарна ці не ўлічваюцца ўвогуле. Праблемным уяўляецца і тое, што ў педагагічнай практыцы ўсё яшчэ недастатковая ўвага надаецца ўліку існуючага дыдактычнага патэнцыялу сістэмнага і комплекснага прымянення традыцыйных і электронных сродкаў навучання пры падрыхтоўцы і самападрыхтоўцы вучняў, а таксама ў працэсе планавання і правядзення факультатыўных заняткаў па гісторыі. Праблемным да сённяшняга часу застаецца вызначэнне шляхоў дасягнення выніковай (на прадукцыйным узроўні) якасці навучання гісторыі. Відавочна, што свайго далейшага навуковага і практычнага абагульнення патрабуюць пошукі эфектыўных метадаў, прыёмаў і сродкаў актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Аб'ектам дыскусій навукоўцаў і практыкаў застаецца ацэнка дасягненняў выпускнікоў школ падчас выніковай атэстацыі і цэнтралізаванага тэсціравання.

Улік тэхналагічнага і дыдактычнага патэнцыялу электронных кампанентаў ВМК па гісторыі Беларусі дазваляе разглядаць ЭСН у якасці эфектыўнага сродку арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў пры яе алгарытмізацыі. Методыка прымянення дадзеных кампанентаў ВМК у межах класна-ўрочнай сістэмы прапануе сістэмнае выкарыстанне розных узаемадапаўняючых сродкаў навучання, якія дазволяць эфектыўна вырашаць увесь комплекс дыдактычных задач. На наш погляд, мэтазгодным уяўляецца такое комплекснае прымяненне ЭСН, якое прадугледжвае адзінства зместу вучэбнага матэрыялу і логікі арганізацыі кожнага асобнага занятка, заснаванай на распрацаваных у педагагічнай тэорыі і практыцы палажэннях.

Сусветная практыка кантролю і ацэнкі якасці падрыхтоўкі выпускнікоў школ засноўваецца не столькі на вызначэнні аб'ёму атрыманых ведаў, колькі на ўменнях прымяняць іх у новых умовах і творча выкарыстоўваць у жыццёвых сітуацыях. У сувязі з гэтым кантоўным уяўляецца дыягностыка вынікаў паспяховасці — рэалізуемы механізм вызначэння ўсіх аспектаў ажыццяўляемага дыдактычнага працэсу, які таксама не можа быць зведзены выключна да традыцыйнага разумення праверкі ведаў, уменняў і навыкаў. Дыягнастычнае адсочванне паспяховасці навучання кожнага старшакласніка па гісторыі Беларусі можна ажыццяўляць з дапамогай тэхналагічнага і дыдактычнага інструментарыя ЭСН, які ўключае кантроль, праверку, ацэнку, накапленне даных, іх аналіз, выяўленне дынамікі змяненняў і асобаснага росту вучня, а таксама неабходную карэкцыю працэсу навучання. Калі праверка ведаў і ўменняў паказвае вынікі (напрыклад, узровень і якасць засваення ведаў) без тлумачэння іх паходжання, то ў сваю чаргу дыягностыка разглядае вынікі навучання ў цеснай узаемасувязі са шляхамі і спосабамі дасягнення выніковасці на прадукцыйным узроўні, вызначае тэндэнцыі і дынаміку фарміравання саміх вынікаў. Традыцыйна пад дасягненнямі вучняў разумеецца аб'ём і ўзровень засвоеных у працэсе навучання ведаў, уменняў і навыкаў, якія вызначаюцца звычайна праз выстаўленне адзнакі. Разам з тым, сутнасць вучэбных дасягненняў вучняў можна разумець і як працэс (рух ад пачатковага ўзроўню да новага якаснага), і як вынік навучання (суаднясенне дасягнутага вучнем узроўню авалодання ведамі ў параўнанні з вызначанымі палажэннямі адукацыйнага стандарту).

Мэтазгодна разглядаць працэс падрыхтоўкі старшакласнікаў да выніковай атэстацыі па гісторыі Беларусі, а таксама да ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні алгарытмічна, у якасці паслядоўна выконваемых этапаў, на кожным з якіх у поўным аб'ёме павінна адсочвацца траекторыя паспяховасці навучання, ажыццяўляцца дыягностыка, кантроль і ацэнка.

Першапачатковы этап прадугледжвае правядзенне структурна-функцыянальнага аналізу і адбору зместу вучэбнага матэрыялу, які павінны засвоіць вучні. Змястоўнымі элементамі рэкамендаваных ЭСН[1] з'яўляюцца паслядоўна змешчаныя ў парадку іх вывучэння буйныя тэматычныя блокі:

1. Старажытнае грамадства.
2. Узнікненне класавага грамадства і беларускай дзяржаўнасці (VI — сярэдзіна XIII ст.).
3. Беларусь у другой палове XIII — першай палове XVI ст.
4. Беларусь у другой палове XVI—XVIII ст.
5. Беларусь у складзе Расійскай імперыі.
6. Беларусь у 1917—1939 гг.
7. БССР у гады Другой сусветнай вайны (1939—1945 гг.).
8. Беларусь у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
9. БССР у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1980-х гг.
10. Беларусь у другой палове 1980-х гг. — 1990 г.
11. Рэспубліка Беларусь у 1991—2010 гг.

У якасці абавязковага крытэрыя пры адборы матэрыялу неабходна ўлічваць асноўныя змястоўныя лініі адукацыйнага стандарту па гісторыі Беларусі, да якіх адносім наступныя:

гістарычны час (суаднясенне гістарычнага факта з вызначаным часам; храналагічная паслядоўнасць і працягласць гістарычных падзей, з'яў і працэсаў; сінхроннасць гістарычных падзей; перыядызацыя гісторыі Беларусі ў кантэксце ўсеагульнай гісторыі);

гістарычная адлегласць (лакалізацыя гістарычных падзей на месцы, дзе яны адбываюцца, лакальнасць і глабальнасць гістарычных працэсаў; геапалітычнае становішча Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды);

гістарычнае развіццё (уяўляецца ў наступных аспектах: антрапалагічным, псіхалагічным, фармацыйным, цывілізацыйным, культуралагічным, этнанацыянальным, дзяржаўна-палітычным, геапалітычным, сацыяльным, філасофскім, аксіялагічным).

У якасці крытэрыя адбору мэтазгодна ўлічваць таксама шматкампанентны склад вучэбных ведаў па гісторыі, якія падлягаюць засваенню вучнямі: тэарэтычныя, факталагічныя (у тым ліку картаграфічныя і храналагічныя), ацэньваючыя, метадалагічныя[2]. Пры гэтым неабходна адзначыць, што фарміраванне гістарычных ведаў у старшых

класах павінна адбывацца на праблемна-тэарэтычным узроўні. Тлумачэнне падзей, з'яў, працэсаў павінна ажыццяўляцца ў першую чаргу праз сістэму агульнагістарычных і сацыялагічных паняццяў, а таксама разуменне заканамернасцей гістарычнага развіцця і іх канкрэтных праяў.

Далейшае ажыццяўленне алгарытмічнай дзейнасці настаўніка мае наступныя агульныя этапы:

– вызначэнне зыходнага і прамежкавага ўзроўняў ведаў вучняў у адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі адукацыйнага стандарту, вучэбнай праграмы, дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі;

– выпрацоўка фармуліровак пытанняў і заданняў, арыентаваных на вызначэнне ўзроўню засваення вучэбнага матэрыялу і сфарміраванасці спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

– забеспячэнне адваротнай сувязі, якая пры эфектыўным ажыццяўленні дыягнастычнай і кантрольна-ацэньваючай дзейнасці ЭСН дае інфармацыю пра якасны стан навучання і магчымасць пераходу вучня з дасягнутага ўзроўню засваення зместу вучэбнага матэрыялу і спосабаў дзейнасці да іншага – больш прадукцыйнага;

– ажыццяўленне працэсу карэкцыі навучання па кожным з тэматычных кірункаў з улікам атрыманых і плануемых (нарматыўных) вынікаў для дасягнення прадукцыйных узроўняў засваення зместу вучэбнага матэрыялу.

Пры рэалізацыі прапанаванага алгарытму па гісторыі Беларусі з выкарыстаннем ЭСН неабходна ўлічваць абавязковасць фарміравання спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, у аснове якіх знаходзяцца такія ўменні і аперацыі, як аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, сістэматызацыя, класіфікацыя, абагульненне.

У сувязі з гэтым у якасці тэхналагічных кірункаў рэалізацыі прапануемай мадэлі падрыхтоўкі старшакласнікаў неабходна вызначыць наступныя:

– развіццё спосабаў дзейнасці і ведаў, звязаных з засваеннем: а) гістарычных фактаў і храналогіі; б) тэарэтычных паняццяў і тэрмінаў; в) праблемных пытанняў развіцця навукі, культуры і мастацтва; г) гістарычнай картаграфіі; д) навыкаў працы з дакументамі; е) гістарычных персаналій і іх ролі ў лёсе Беларусі і інш.

– выпрацоўка навыкаў выканання тэставых заданняў рознага тыпу;

– выпрацоўка стратэгіі і тактыкі выканання комплексаў тэставых заданняў;

– выпрацоўка навыкаў псіхалагічнага трэнінгу і адаптацыі.

На кожным з гэтых кірункаў эфектыўную дапамогу аказваюць як традыцыйныя (падручнік, хрэстаматыя, інфармацыйна-даведачныя выданні, рабочыя сшыткі, картаграфічны матэрыял), так і электронныя кампаненты ВМК па гісторыі Беларусі.

Важную ролю ў падрыхтоўцы вучняў адыгрывае мэтанакіраваная праца з інфармацыйнымі рэсурсамі. Менавіта элементарнае няўменне ажыццяўляць пошук, адбор і структураванне неабходнай вучэбнай інфармацыі ў электронных сетках назіраецца ў многіх студэнтаў-першакурснікаў. У сувязі з гэтым неабходна акцэнтаваць увагу настаўнікаў гісторыі на асаблівасцях і спецыфіцы выкарыстання ЭСН, якія вызначаюцца ў наступным:

– магчымасць арганізацыі праблемна-пошуковай і даследчыцкай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў па пошуку, адбору і вывучэнню вучэбнай гістарычнай інфармацыі, арыентаванай на апісанне фактаў мінулага на матэрыялах гістарычных крыніц, з дапамогай электронных энцыклапедый, электронных версій вучэбных дапаможнікаў, рэсурсаў Інтэрнет;

– засваенне зместу матэрыялу ў суадносінах са шматкампанентным зместам вучэбных гістарычных ведаў (тэарэтычныя; факталагічныя, у тым ліку храналагічныя і картаграфічныя; металагічныя; ацэначныя веды і спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці);

прадстаўленне ў ЭСН фармалізаваных (канкрэтныя, адзінкавыя падзеі, іх месца і час, удзельнікі, паняційна-тэрміналагічны апарат, тэарэтычныя палажэнні) і нефармалізаваных (суб'ектыўныя ўяўленні, меркаванні і ацэнкі, версіі) вучэбных гістарычных ведаў;

засваенне вучэбных гістарычных ведаў з улікам сутнаснай прыроды гістарычнага факта (як падзеі ці з'явы гістарычнай рэчаіснасці; як паведамлення крыніцы; як выніка навуковай інтэрпрэтацыі), прадстаўляемага ў ЭСН з дапамогай кінафотафонадакументаў, электронных прэзентацый;

– магчымасць фарміравання і развіцця спецыяльных гістарычных уменняў па рэканструкцыі і інтэрпрэтацыі гістарычных падзей і працэсаў з дапамогай мультымедыйных прэзентацый, анімаваных карт, дынамічных структурна-лагічных схем;

– магчымасць вызначэння ступені дакладнасці, суб'ектыўнага ці аб'ектыўнага характару дакументальных гістарычных матэрыялаў, прадстаўляемых з дапамогай электронных хрэстаматый і тэматычных сайтаў сеткі Інтэрнет;

– магчымасць ажыццяўлення дыягностыкі зыходнага ўзроўню падрыхтоўкі, кантролю і ацэньвання ўзроўню засваення фармалізаваных тэарэтычных і факталагічных ведаў з дапамогай тэставага інструментарыя, а нефармалізаваных ацэначных ведаў – з дапамогай заданняў са свабодна фармулюемым адказам.

У працэсе арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі мэтазгодным уяўляецца вызначэнне наступных метадычных умоў сістэмнага прымянення ЭСН:

– выкананне ЭСН дыдактычнай ролі па кіраванню працэсам засваення вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу пры камп'ютэрнай падтрымцы традыцыйных кампанентаў ВМК на ўсіх этапах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці пры яе алгарытмізацыі;

– пераадоленне фрагментарнага характару прадстаўляемага ў ЭСН зместу вучэбнага матэрыялу праз яго структурыраванне па праблемна-модульным прынцыпе ў суадносінах з кампанентамі вучэбных гістарычных ведаў;

— забеспячэнне праблемна-тэарэтычнага, пошуковага і даследчыцкага падыходаў у вывучэнні гісторыі праз праблематызацыю працэсу навучання, а таксама абавязковае прадстаўленне ў ЭСН і засваенне вучнямі гістарычных ведаў тэарэтычнага характару;

– рэалізацыя дзейнаснага кампанента прадметнага навучання, арыентаванага на фарміраванне ўменняў вучняў працаваць з храналагічным, картаграфічным матэрыялам, гістарычнымі крыніцамі;

– прадастаўленне вучням магчымасці вызначаць індывідуальную форму навучання ў межах зададзенага ў ЭСН механізму алгарытмізацыі вучэбных дзеянняў з улікам калектыўна-групавой і індывідуальнай форм арганізацыі вучэбнай працы;

– вызначэнне паказчыкаў паспяховасці навучання, якія ўжываюцца ў кантрольна-ацэначным інструментарыі ЭСН пры выкарыстанні комплексу *рознаўзроўневых тэставых заданняў у суадносінах* з узроўнямі засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыяла;

– забеспячэнне вучня пастаяннай інфармацыяй аб бліжэйшых і перспектыўных мэтах навучання і ступені іх дасягнення;

– улік высокай матывацыі вучняў да навучання з выкарыстаннем камп'ютэра і ЭСН;

– ажыццяўленне карэктуючай функцыі ЭСН для дасягнення вучнямі прадукцыйных узроўняў засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыяла і спосабаў дзейнасці пры забеспячэнні індывідуалізацыі навучання;

— сістэмнае і комплекснае выкарыстанне электронных і традыцыйных сродкаў навучання па гісторыі Беларусі.

Выкананне прапанаванага алгарытму і вызначаных метадычных умоў пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі і працэдуры цэнтралізаванага тэсціравання дазволіць старшакласнікам дасягнуць прадукцыйных узроўняў засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыяла і спосабаў дзейнасці. Спіс рэкамендаванай літаратуры, якая можа быць выкарыстана ў час падрыхтоўкі выпускнікоў, змешчаны ў аўтарскіх выданнях[3]. Для рэалізацыі дадзеных прынцыповых палажэнняў быў распрацаваны комплекс крытэрыяльна-арыентаваных тэставых заданняў па гісторыі Беларусі, якія змястоўна ахопліваюць усе тэматычныя напрамкі.

## Комплекс тэставых пытанняў і заданняў па гісторыі Беларусі

*Выберыце правільны адказ.*

1. Печ, якая служыла для атрымання крычнага жалеза: а) крыца; б) домніца; в) лунніца; г) борць.

2. Навуковы тэрмін, якім вызначаюць прышлае насельніцтва пэўнай этнічнай тэрыторыі: а) алахтоны; б) аўтахтоны; в) дзедзічы; г) ізгоі.

3. Назва горада, які, паводле гістарычных крыніц, быў адным з цэнтраў усходнеславянскага племяннога аб'яднання дрыгавічоў: а) Берасце; б) Гомель; в) Пінск; г) Полацк.

4. Рэгіён, адкуль на беларускія землі ў IX – X стст. траплялі дырхемы: а) Блізкі Усход; б) Заходняя Еўропа; в) Кіеўская зямля; г) Скандынавія.

5. Паняцце, прысутнасць якога ў пісьмовых гістарычных крыніцах з'яўляецца сведчаннем існавання ва ўсходніх славян збору даніны з падуладнага князю насельніцтва: а) волак; б) віра; в) ардынічына; г) налюддзе.

6. Дата хрышчэння Русі: а) 980 г.; б) 984 г.; в) 988 г.; г) 990 г.

7. Твор выяўленчага мастацтва — малюнак, зроблены вадзянымі фарбамі на сырой тынкоўцы: а) абраз; б) апсіда; в) мініяцюра; г) фрэска.

8. Горад, які ў сярэдзіне XIII ст. стаў цэнтрам аб'яднання ўсходнеславянскіх і балцкіх земель у адзіную дзяржаву: а) Вільня; б) Навагрудак; в) Полацк; г) Тураў.

9. Калі адбылася бітва над Клецкам паміж войскамі ВКЛ (на чале з М.Глінскім) і татарамі: а) у 1348 г.; б) у 1399 г.; в) у 1410 г.; г) у 1506 г.

10. Гаспадарскі суд у ВКЛ да 1581 г. – гэта: а) вышэйшая судовая інстанцыя ў дзяржаве; б) суд прысяжных; в) шляхецкі суд звычаёвага права; г) царкоўны суд па рэлігійных справах.

11. У гісторыі ВКЛ Васіль Гарабурда, Пётр Мсціславец, браты Мамонічы — гэта: а) прадстаўнікі радыкальнай плыні ў антытрынітарызме; б) знакамітыя літаратары-палемісты; в) прыхільнікі царкоўна-рэлігійнай уніі; г) прыхільнікі рэнесансава-гуманістычных поглядаў, асветнікі і кнігадрукары.

12. Горад у ВКЛ, які першым атрымаў магдэбурскае права: а) Гародня; б) Віцебск; в) Мінск; г) Магілёў.

13. Горад, у якім у перыяд існавання Рэчы Паспалітай дзейнічала брацкая друкарня: а) Гародня; б) Віцебск; 3) Мінск; 4) Магілёў.

14. Дзейнасць у ВКЛ Ж.Э.Жылібера з'яўляецца сведчаннем: а) паспяховай дзейнасці Адукацыйнай камісіі; б) развіцця беларускага выяўленчага мастацтва; в) развіцця лацінамоўнай паэзіі; г) распаўсюджвання навуковых ведаў і ідэй Асветніцтва.

15. Капіталістычнае прадпрыемства, якое заснавана на ручной працы і шырокім яе падзеле: а) ла-

тыфундыя; б) мануфактура; в) рамесніцкі цэх; г) фабрыка.

16. Калі было створана таварыства філаматаў у Віленскім універсітэце: а) у 1813 г.; б) у 1817 г.; в) у 1820 г.; г) у 1825 г.

17. Феадальныя перажыткі, якія існавалі ў беларускіх губернях пасля 1861 г.: а) адпрацоўкі і выкупныя плацяжы; б) водрубы і хутарская арганізацыя; в) адыходніцтва і церасналосіца; г) малазямелле і падушнае падаткаабкладанне.

18. Ідэя, з якой у 1916 г. выступілі браты Луцкевічы, В.Ластоўскі і інш.: а) стварэнне канфедэрацыі Літвы і Заходняй Беларусі ў форме ВКЛ; б) абвяшчэнне Беларусі парламенцкай рэспублікай на чале з сеймам у Вільні; в) аўтаномія Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі; г) усталяванне дыктатуры пралетарыяту.

19. Аўтар Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада ССРБ: а) З.Жылуновіч; б) В.Кнорын; в) А.Мяснікоў; г) А.Чарвякоў.

20. Назва надзвычайнай эканамічнай палітыкі савецкай улады ў гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі: а) "ваенны камунізм"; б) новая эканамічная палітыка (НЭП); в) харчпадатак; г) харчразвёрстка.

21. БДУ быў заснаваны ў: а) 1919 г.; б) 1920 г.; в) 1921 г.; г) 1925 г.

22. Прычына, якой тлумачыўся роспуск КПЗБ і КСМЗБ у афіцыйных дакументах Выканкама Камінтэрна: а) змяншэнне колькасці членаў КПЗБ і наяўнасць унутранага расколу ў яе арганізацыях; б) пранікненне ў партыю і камсамол правакатараў; в) рэпрэсіі супраць кіраўніцтва КПЗБ і КСМЗБ; г) неабходнасць часовага спынення дзейнасці партыі і камсамола.

23. Найбольш папулярныя формы кааперацыі ў беларускай вёсцы ў час ажыццяўлення новай эканамічнай палітыкі: а) арцелі і ТАЗы; б) калгасы; в) камбеды; г) камуны.

24. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР адбылося: а) у 1937 г.; б) у 1938 г.; в) у 1939 г.; г) у 1940 г.

25. Адной з галоўных прычын адступлення войск Заходняй Асобай ваеннай акругі ў начатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны была: а) перавага партызанскай тактыкі вядзення баявых дзеянняў; б) непадрыхтаванасць да вядзення наступальных аперацый; в) непадрыхтаванасць да вядзення абарончых дзеянняў; г) дзейнасць дыверсантаў.

26. У гады Вялікай Айчыннай вайны назва "Фатэрланд" абазначала: а) кодавую назву германскага плана каланізацыі Усходняй Еўропы; б) кодавую назву карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх акупантаў супраць партызан Беларусі; в) умоўную назву канфігурацыі лініі фронту, якая склалася да пачатку аперацыі "Баграціён"; г) умоўную назву глыбока эшаланіраванай лініі абароны нямецка-фашысцкіх войск на тэрыторыі Беларусі.

27. Паняцце, якое азначае комплекс пераўтварэнняў сацыялістычнага будаўніцтва ў Заходняй Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе: а) калектывізацыя; б) карэнізацыя; в) саветызацыя; г) хутарызацыя.

28. Прозвішча выдатнага беларускага драматурга, аўтара п'есы "Мудрамер": а) А.Дудараў; б) К.Крапіва; в) А.Макаёнак; г) М.Матукоўскі.

29. Вызначыце правільную паслядоўнасць з'яўлення прылад працы ў гісторыі старажытнага грамадства: а) рала; б) лук і стрэлы; в) керамічныя вырабы; г) палка-капалка.

30. Вызначыце правільную храналагічную паслядоўнасць наступных працэсаў: а) пачатак дзяржаваўтваральных працэсаў на ўсходнеславянскіх землях; б) завяршэнне фарміравання беларускай народнасці; в) пачатак пранікнення ідэй Адраджэння і Рэфармацыі ў беларускую культуру; г) складванне ўмоў фарміравання адзінай народнасці.

31. Вызначыце правільную храналагічную паслядоўнасць наступных падзей: а) абвяшчэнне дэкларацыі манархаў Еўропы аб праве на ўзброенае ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы іншых краін; б) дараванне Канстытуцыі Царству Польскаму; в) спыненне дзейнасці Статута ВКЛ 1588 г. на ўсёй тэрыторыі Беларусі; г) шляхецкае нацыянальна-вызваленчае паўстанне, адным з кіраўнікоў якога быў А.Чартарыйскі.

32. Вызначыце правільную храналагічную паслядоўнасць наступных прадзей: а) пачатак палітыкі беларусізацыі; б) пачатак рэформы беларускага правапісу; в) стварэнне першага беларускага мастацкага фільма; г) утварэнне Беларускай акадэміі навук.

33. Вызначыце правільную храналагічную паслядоўнасць наступных падзей: а) вызваленне Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; б) вызваленне Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; в) вызваленне Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; г) вызваленне Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

34. Вызначыце правільную храналагічную паслядоўнасць наступных падзей: а) выбары першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; б) абвяшчэнне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР; в) скліканне II Усебеларускага народнага схода; г) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

35. Суаднясіце паняцці з адпаведнымі азначэннямі.

1) віра; 2) верв; 3) пагост; 4) палюддзе;

а) абшчына ўсходніх славян; б) месца збору даніны; в) збор даніны з падуладнага насельніцтва; г) права збору даніны з пэўнай тэрыторыі; д) судовы штраф.

36. Суаднясіце назвы пісьмовых гістарычных помнікаў з датамі іх стварэння.

1) "Устава на валокі"; 2) Прывілей Казіміра Ягайлавіча; 3) Судзебнік Казіміра Ягайлавіча; 4) Статут ВКЛ;

а) 1447 г.; б) 1468 г.; в) 1529 г.; г) 1557 г.; д) 1563 г.

37. Суаднясіце назвы пісьмовых гістарычных помнікаў з урыўкамі з іх.

1) акт Люблінскай уніі; 2) Пастанова сейма 1673 г.; 3) "Прамова Мялешкі"; 4) Статут ВКЛ 1588 г.;

а) "... аб Жыгімонце першым салодкая памяць. Ён ляхаў з іх хітрасцю вельмі не любіў, а Літву і Русь нашу любіцельна мілаваў"; б) "Дазваляецца набываць маёнткі і валодаць імі паляку ў Літве, а ліцвіну ў Польшчы"; в) "... кожны трэці сойм павінен збірацца ў Вялікім княстве Літоўскім, у горадзе Гародне"; г) "У тым паньстве, Вялікім княстве Літоўскім ... званняў духоўных і свецкіх, гарадоў, двароў, грунтаў, староствaў, трыманняў, пасадаў ніякім чужаземцам і замежнікам даваць не маем"; д) "Прыйдзе час, — паны-палякі да дзвярэй не патрапяць: праз вокны іх выкідваць будзем".

38. Суаднясіце прозвішчы аўтараў з назвамі іх твораў.

1) І.Насовіч; 2) М.Каяловіч; 3) П.Шпілеўскі; 4) П.Шэйн;

а) "Слоўнік беларускай гаворкі"; б) "Беларускі зборнік"; в) "Матэрыялы да вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю"; г) "Падарожжа па Палессі і Беларускім краі"; д) "Чытанні па гісторыі Заходняй Расіі".

39. Суаднясіце даты з падзеямі.

1) 1920 г.; 2) 1922 г.; 3) 1924 г.; 4) 1926 г.;

а) першае ўзбуйненне тэрыторыі БССР; б) другое ўзбуйненне тэрыторыі БССР; в) другое абвяшчэнне БССР; г) прыняцце Канстытуцыі "перамогшага сацыялізму"; д) утварэнне СССР.

40. Суаднясіце прозвішчы аўтараў з назвамі іх твораў.

1) І.Навуменка; 2) М.Лынькоў; 3) А.Куляшоў; 4) В.Быкаў;

а) "Векапомныя дні"; б) "Сасна пры дарозе"; в) "Трэцяя ракета"; г) "Глыбокая плынь"; д) "Сцяг брыгады".

Запоўніце пропускі.

41. Рашучыя змяненні ў сацыяльна-эканамічнай арганізацыі старажытнага грамадства, якія ў перыяд каменнага века прывялі да пераходу да аселага ладу жыцця і вытворчай гаспадаркі, атрымалі ў навуцы назву ... рэвалюцыі.

42. Ва ўсходніх славян ... — гэта назва цэнтральнай умацаванай часткі ў структуры старажытнага горада.

43. З XV ст. вышэйшым саслоўна-прадстаўнічым органам дзяржаўнага кіравання ў ВКЛ быў ...

44. Будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. суднаходных каналаў сведчыла аб развіцці такой галіны эканомікі як ...

45. ... — гэта абрэвіятурная назва дзяржавы, абвешчанай ва ўмовах дэнансацыі ўмоў Брэсцкага міру і адступлення нямецкіх войскаў; з'яўлялася, на думку гісторыкаў, палітычнай структурай з зародкамі дзяржаўнай улады на савецкай аснове на тэрыторыі Беларусі.

46. ... — гэта паняцце, якое азначае скасаванне органамі дзяржаўнай улады падпісанага раней дагавора, у тым ліку і міжнароднага.

47. "..." — гэта назва канфігурацыі лініі савецка-германскага фронту, якая склалася напярэдадні правядзення ваенна-стратэгічнай аперацыі "Баграціён".

48. ... — гэта новая гістарычная супольнасць людзей, пра ўзнікненне якой заявіў на XXIV з'ездзе КПСС Генеральны сакратар ЦК КПСС Л.Брэжнеў.

49. Згодна арт. 1 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь наша краіна — унітарная дэмакратычная ... прававая дзяржава.

50. ... — гэта паняцце, якое азначае працэс распаўсюджвання і замацавання форм дзяржаўнага ладу, заснаваных на прынцыпе народаўладдзя, свабоды, роўнасці грамадзян.

**Адказы:** 1 — б; 2 — а; 3— в; 4 — а; 5 — г; 6 — в; 7 — г; 8 — б; 9 — г; 10 — а; 11 — г; 12 — б; 13 — г; 14 — г; 15 — б; 16 — б; 17 — а; 18 — а; 19 — а; 20 — а; 21 — в; 22 — б; 23 — а; 24 — в; 25 — в; 26 — г; 27 — в; 28 — г; 29: г, б, в, а; 30: а, г, в, б; 31: б, а, г, в; 32: а, в, г, б; 33: в, г, б, а; 34: б, г, а, в; 35: 1—д, 2—а, 3—б, 4—в; 36: 1—г, 2—а, 3—б, 4—в; 37: 1—б, 2—в, 3—а, 4—г; 38: 1—а, 2—д, 3—г, 4—в; 39: 1—в, 2—д, 3—а, 4—б; 40: 1—б, 2—а, 3—д, 4—в; 41 — неалітычнай; 42 — дзяцінец; 43 — сейм; 44 — гандаль; 45 — ССРБ (БССР); 46 — дэнансацыя; 47 — "Беларускі балкон"; 48 — савецкі народ; 49 — сацыяльная; 50 — дэмакратызацыя.

---

[1] Бакалаўр: гісторыя Беларусі ад старажытнасці і да пач. XXI ст. [Электронный ресурс]. — Электрон. дан. и прогр. (653 Мб). Пинск : Лозицкий В.Л., 2000; Гісторыя Беларусі. Тэматычныя тэсты [Электронный ресурс]. Электрон. дан. и прогр. (85 Мб). Мн., 2007.

[2] Гора П.В. Повышение эффективности обучения истории в средней школе. М., 1988.

[3] Лазіцкі В.Л. Практыкум па гісторыі Беларусі: падрыхтоўка да тэсціравання і экзамену. Мн., 2007; Ён жа. Супертрэнінг. Гісторыя Беларусі: матэрыялы для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання. Мн., 2010; Ён жа. Трэнажор па гісторыі Беларусі для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену. М., 2010.